ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
23
САКАВІКА
№ 10(1603)

## Мы крочым у будучае

**АДБЫЛОСЯ ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭННЕ КАМІСІІ ПАРТЫЙНАГА КАМІТЭТА УНІВЕРСІТЭТА ПА САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАМУ РАЗВІЦЦЮ УНІВЕРСІТЭТА. НА ІМ ВЫСТУПІЎ РЭКТАР, АКАДЭМІК АН БССР Л. І. КІСЯЛЕЎСКІ.**

Адпаведна перспектыўнаму плану развіцця да 2000 года універсітэту трэба будзе пабудаваць 23 аб'екты з агульным аб'ёмам фінансавання на суму звыш 100 мільёнаў рублёў. На новай пляцоўцы ў 130 гектараў у раёне Паўднёвага Захаду і вёскі Шчамысліца ў гэтым годзе пачнецца будаўніцтва корпуса для біялагічнага факультэта, студэнцкага інтэрната на 1000 месц. Плануецца таксама ўвод у эксплуатацыю спартыўнага комплексу (вул. Кастрычніцкая) і 107-кватэрнага жылога дома для маласямейных супрацоўнікаў. З 1990 года пачнецца будаўніцтва галоўнага корпуса універсітэта, разлічанага на размяшчэнне прыродазнаўчых факультэтаў. У той жа час будзе весціся рэканструкцыя карпусоў па вул. Бабруйскай і старога фізічнага корпуса, у якім плануецца размясціць залу пасяджэнняў вучонага савета, музей, прафесарскую, кафэ, пакой для вядзення дыскусій. Сумесна з Метрабудам на тэрыторыі універсітэцкага гарадка будзе пабудавана студэнцкая сталовая на 250 месц. У раёне вёскі Шчамысліца будзе батанічны сад універсітэта, а непадалёку ад гарадскога пасёлка Ракаў (Аксакаўшчына) у 1990 годзе запланавана будаўніцтва пансіяната для адпачынку супрацоўнікаў і іх сямей.

Разгледжаны пытанні аб правядзенні сацыялагічных даследаванняў з мэтай выдання пашпарта універсітэта (апісанне плошчаў, размешчаных на іх будынкаў) і састаўленні плана сацыяльна-эканамічнага развіцця універсітэта на наступную пяцігодку.

П. КУХАРЧЫК,
старшыня камісіі,
загадчык лабараторыі
НДІ ПФП.

## ТЭЛЕТАЙП

### АДРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

пачалося. І ў нашым універсітэце таксама. Аб гэтым гаворыць стварэнне камісіі рэктарата і партыйнага камітэта па развіццю беларуска-рускай двухмоўнасці. На нядаўнім яе пасяджэнні ішла гаворка аб тым, ці варта з гэтага года пры паступленні на педагагічныя спецыяльнасці БДУ уводзіць экзамен па беларускай мове. Пасля грунтоўнага і ўсебаковага абмеркавання сышліся на думцы: гэта рабіць рана. Мы можам страціць здольных абітурыентаў: у школах пакуль недастаткова ўвагі ўдзяляецца навучанню на беларускай мове. На першым часе мэтазгодна праводзіць з паступаючымі гутарку.

Асаблівую заклапочанасць члены камісіі выказалі наконт таго, што да гэтага часу яны так і не дачакаліся ад выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта канкрэтных прапаноў па пашырэнню выкарыстання беларускай мовы.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### У СЯРЭДЗІНЕ КРАСАВІКА

адбудзецца пасяджэнне партыйнага камітэта па абмеркаванню шляхоў паляпшэння палітыка-выхаваўчай работы ў калектывах універсітэта. Партком запрашае ўсіх жадаючых выказаць свае заўвагі і прапановы па ўдасканаленню гэтага напрамку дзейнасці (іх вы можаце падаць у партком ці ў рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт»).

ПАРТЫЙНЫ КАМІТЭТ.

### «ЯНЫ ДОРАЦЬ ЖЫЦЦЁ»

— так часта гавораць пра донараў. А вы не хочаце папоўніць іх рады? Калі так, то чакаем вас — студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі — у паліклініцы універсітэта (вул. Бабруйская, 9) 28, 29, 30 і 31 сакавіка з 10.00 да 14.00 гадзін.

КАМІТЭТ ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА.

### ФЕСТЫВАЛЬ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

замежных студэнтаў, што вучацца ў Мінску, запрашае вас 2 красавіка паглядзець выступленні самадзейных калектываў універсітэта. Вас чакаюць з 11.00 да 12.15 гадзін у Палацы культуры камвольнага камбіната. Дарэчы, тут 13 мая а 18-й гадзіне пачнецца заключны канцэрт пераможцаў фестывалю.

З. ВАЛНІСТЫ.

Маналог зацікаўленага чалавека

## А справа — дзе?



АМАЛЬ два гады я вучуся на факультэце журналістыкі і столькі ж назіраю за станам вучэбнай газеты «Журналіст». Здавалася б, ва ўмовах перабудовы, калі цэнтральныя друкаваныя выданні праводзяць у жыццё прынцыпы публічнасці, плюралізму, павінны адбывацца пэўныя змены і ў іншых газетах. У якой ступені гэта датычыць «Журналіста»?

Газета факультэта журналістыкі з'яўляецца нерэнтабельнай, стратнай, бо выходзіць тыражом 200—300 экземпляраў. Чаму ў БПІ раптам склаліся магчымасці выдання асабістага часопіса «Студэнцкая думка», які, дарэчы, распаўсюджваецца зараз па ўсяму Мінску, а на журфаку такога няма і быць не можа? Чаму наша вучэбная газета выходзіць толькі дзесяць разоў у год? У дадатак, нават той «Журналіст», які мы маем сёння, не распаўсюджваецца на факультэце па вуліцы Свярдлова, а каб убачыць, патрэбна абавязкова шукаць яго на Маскоўскай. Пэўна, рэдакцыя не зацікаўлена ў тым, каб газету чыталі.

Можна пералічыць мноства спраў, за якія браўся наш камітэт камсамола на чале з Яраславам Беклямішавым, але, на жаль, не многія з іх даведзены да канца. Адна з гэтых добрых і маючых здзейсніцца спраў — наш друкаваны «Журналіст». У мінулым годзе былі спробы камітэта камсамола зрабіць газету сапраўдным рупарам перабудовы на факультэце, люстэркам студэнцкай і выкладчыцкай думкі, нашай дзейнасці ў журналістыцы, нашай пазіцыі ў адносінах да з'яў, якія адбываюцца ў грамадстве,— маецца на ўвазе цудоўная ідэя ператварыць газету з наглядна-агітацыйнага экрана ў сапраўдны орган дэмакратыі, ва ўрадлівае поле павышэння журналісцкага майстэрства. Камітэт камсамола даволі дакладна ўяўляў сабе, што для гэтага трэба: па-першае, павялічыць тыраж, выйсці на распаўсюджванне газеты не ў замкнутым коле факультэта, а значна шырэй — праз Саюздрук па горадзе, стварыць прадумовы матэрыяльнай стымуляцыі аўтараў і карэспандэнтаў, павялічыць афіцыйны штат супрацоўнікаў, прадугледзець таксама сапраўдны плюралізм думак.

Спробы камітэта камсамола вырашыць пытанні вакол «Журналіста» працягваюцца. Калі некалькі прадстаўнікоў камітэта пры ўдзеле найбольш актыўных камсамольцаў падрыхтавалі «вострыя» нумар газеты па выбарах кандыдатаў у народныя дэпутаты СССР, ён без прамаруджвання пайшоў у друк. Але калі студэнты, атрымаўшы добры эмацыянальны зарад ад выхаду нумара ў свет, пажадалі гэтак жа працаваць і далей (нават не атрымліваючы пры гэтым ганарараў), справа аказалася за сям'ю пячаткамі. Чаму? Вынік гэты абумоўлены і зразумелы: у тых матэрыяльных умовах, у якіх знаходзіцца зараз «Журналіст», аб крытычнасці і дзейснасці яго не можа весціся ніякай гаворкі.

Ці можа такая газета быць выхавацелем смелай і праўдзівай плыні журналісцкіх кадраў?

У апошні час шмат думаю аб тым, што няма на факультэце той справы, якая б магла аб'яднаць нас і даць неабходны шанц да авалодвання прафесійным майстэрствам, быць школай журналісцкага выхавання. На жаль, насценная газета такой справай стаць не можа. І пераважна з-за таго, што яна не стымулюе, што яна абмежаваная, у адзіным экземпляры. Менавіта таму, што яна насценная. А ці змог бы такой справай стаць «Журналіст» друкаваны? Безумоўна.

А мы пакуль што жывём больш-менш выпадковымі з'яўленнямі ў рэдакцыях у якасці «амаль супрацоўнікаў», дзе з многімі проста не хочуць займацца, дзе ёсць неабходнасць у прафесіяналах, але няма патрэбы ў практыкантах. Да таго ж, у рэдакцыях у выхаванні маладых журналістаў ніхто не зацікаўлены, калі гэта і робіцца, то толькі дзякуючы свядомасці, сумленню і сумленнасці саміх работнікаў рэдакцый. Але ж гэта даволі хісткія стымулы. А як было б добра пры наяўнасці рэальна існуючай (а не паказной) газеты факультэта і пры ўдзеле ў ёй плеяды вопытных і таленавітых настаўнікаў-журналістаў, кожны з якіх вёў бы, скажам, групу ў 5—6 студэнтаў праз усе церніі журналістыкі ад самага пачатку і да самага выпуску. І гэта не ўтопія, бо на «дзікім Захадзе» ужо даўно існуюць і даюць адпаведныя станоўчыя вынікі менавіта такія формы адукацыі.

І. ДРАПУН,
студэнт факультэта
журналістыкі.

Спартакіяда

## БЛІСКУЧЫХ ПЕРАМОГ!

*У САКАВІКУ ў Мінску пачнецца XV Спартакіяда замежных студэнтаў, якія вучацца ў вышэйшых навучальных установах. У яе праграму ўвойдуць спаборніцтвы па розных відах спорту: баскетболу, валейболу, настольнаму тэнісу, лёгкай атлетыцы, футболу.*

*У саставе універсітэцкай зборнай па лёгкай атлетыцы выступяць нашы вядомыя спартсмены — студэнты фізфака Мігель Карэн і Хорхе Альварада. Хорхе — чэмпіён БДУ у забегу на 1500 і 3000 м, а таксама чэмпіён XIV Спартакіяды замежных студэнтаў па кросу і бегу на 800 м.*

*У зборнай камандзе па футболу — студэнт філфака Леамі Рамбелунандрыаніна. Чэмпіёны Спартакіяды замежных студэнтаў па валейболу Хасэ Луіс і Расента Брава — студэнты фізічнага факультэта — таксама прымуць удзел у спаборніцтвах.*

*Да ведама замежных студэнтаў: хто жадае прыняць удзел у Спартакіядзе, могуць падрыхтавацца да яе, запісаўшыся ў секцыі па валейболу, настольнаму тэнісу, лёгкай атлетыцы. Гэта дапаможа вам дасягнуць бліскучых перамог.*

*І. МЕХАНІКАВА,*
*студэнтка факультэта*
*журналістыкі.*

Аддзяленне сувязі

## Пáрадам кіруе папера

*ЗУСІМ нядаўна я праходзіў педпрактыку ў Мінскім педагагічным вучылішчы № 2. Сустрэўшыся з яго дырэктарам, здаецца, трапіў гадоў на восем назад. Вырашэнне колькіх пытанняў ідзе з дапамогай галасавых звязак. А якая непрымірымасць у яго да вашых думак, якія абавязкова павінны падлягаць цэнзуры, перш чым быць выказанымі навучэнцам!*

*Ну каму, скажыце, зараз прыйдзе ў галаву забараніць насіць джынсы дзяўчатам? А вось дырэктару такая думка да спадобы. Справа, зразумела, не ў джынсах, а ў тым, што для гэтага чалавека галоўны прынцып «Не пушчаць!».*

*Менавіта ён і падобныя да яго кіраўнікі даюць характарыстыкі студэнтам-практыкантам. Якія ж тут новыя методыкі па выкладанню прадметаў? Дзе праблемы для дыскусій з навучэнцамі? За кожным словам і крокам тваім сочаць пільныя вочы дырэктара, ад якога ты знаходзішся ў непасрэднай залежнасці.*

*Я мяркую: прыйшоў час адмовіцца ад непатрэбных папер: розных характарыстык і анкет, якія заблыталі наша жыццё ў гады застою.*

*Адзнаку па практыцы павінен выстаўляць першакласны спецыяліст-педагог, а не кансерватар ад педагогікі. Тады яна будзе адзіным крытэрыем у вызначэнні педагагічных здольнасцей студэнта.*

*Ігар ЛАПША,*
*студэнт V курса*
*гістарычнага факультэта.*

## Чаму тэатру цяжка?

НА ПЕРШЫ погляд складваецца ўражанне, што гэта ўстанова несур'ёзная, неарганізаваная і неабавязковая. Вытрымаць увесь хаос, што пануе ў студэнцкім тэатры БДУ, могуць, відаць, толькі фанатыкі.

Гэта адна з прычын, чаму тэатру цяжка існаваць: пастаянных артыстаў мала — каля шасці. Хоць з такой колькасцю людзей асабліва не разгонішся, тэатр не стаіць на месцы: з п'есай «Юбілей» А. П. Чэхава артысты ўжо выступаюць, дзве іншыя знаходзяцца ў стадыі рэпетыцый. Магчыма, дзякуючы самаадданасці і намаганням рэжысёра Барыса Пятровіча Вторава і саміх артыстаў, пастаноўка адной з п'ес хутка будзе закончана.

Урэшце, наш тэатр апынуўся пад дахам, якога да апошняга часу не было. Дзякуй і за часовую прапіску ў памяшканні клуба «Красавік» (інтэрнат № 6). Матэрыяльнай дапамогі ніякай. Тэатр існуе на голым энтузіязме.

Не зразумела, ці патрэбен тэатр універсітэту. Нам хацелася б, каб ён, нарэшце, атрымаў нейкую дапамогу і рэкламу і перастаў знаходзіцца на правах беднага сваяка.

Таго ж энтузіязму студэнтам і некаторым выпускнікам хопіць, каб працаваць надалей, таму што свой тэатр яны любяць.

І яшчэ. Нягледзячы на нашы цяжкасці, запрашаем жадаючых прыняць удзел у творчым конкурсе, які праводзіцца ў памяшканні клуба «Красавік» па панядзелках і пятніцах з 19.30.

МАРЫЯНА ЯРЭМАВА,
удзельніца студэнцкага тэатра.

## Выбары і наш выбар

**Сустрэчы для пісьменніка — з'ява звычайная. Але на гэту, у Белдзяржуніверсітэт, Ніл Сямёнавіч Гілевіч ішоў у першую чаргу не ў якасці літаратара, а як кандыдат у народныя дэпутаты СССР па Мінскай — Ленінскай тэрытарыяльнай выбарчай акрузе № 563. І такіх сустрэч у яго таксама не злічыць — па тры-чатыры ў дзень. Перад кожнай з іх Ніл Сямёнавіч адчувае асаблівае напружанне: хто яго ведае, аб чым спытаюць выбаршчыкі. А пытанні — самыя розныя і нечаканыя. У гэтым вы пераканаецеся, прачытаўшы інтэрв'ю студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў фізічнага факультэта з Н. С. ГІЛЕВІЧАМ.**

РАДКІ З БІЯГРАФІІ: Н. С. Гілевіч — першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі, прафесар, лаўрэат Міжнароднай прэміі імя Хрыста Боцева і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы, заслужаны дзеяч навукі рэспублікі, дэпутат Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

# Ніл ГІЛЕВІЧ:
# «Саветам — рэальную ўладу!»

**— Ніл Сямёнавіч, у Белдзяржуніверсітэце вы працавалі больш дваццаці гадоў. Ці наклала гэта нейкі адбітак на Ваш літаратурны лёс?**

— Пісаць я пачаў задоўга да вучобы ў БДУ — ледзь споўнілася пятнаццаць гадоў. У той час я марыў стаць настаўнікам, таму і спыніў свой выбар на педвучылішчы. Але заняцца любімай справай адразу не ўдалося — паступіў ва універсітэт, потым у аспірантуру. Будучы студэнтам шмат пісаў, мае вершы друкаваліся. У гэты час стаў членам Саюза пісьменнікаў.

Затым была праца ва універсітэце: цікавая, захапляючая, плённая. Выйшла кніжка «Акрыленая рэвалюцыяй», якая і стала маёй дысертацыяй. Асабліва па душы прыйшлося тое, што мне прапанавалі выкладаць не літаратуру, як планавалася, а фальклор. У мяне ўжо былі некаторыя запісы гэтага народнага скарбу. Я любіў перачытваць іх па некалькі разоў, углядацца ў філасофскую і маральную глыбіню твораў, адчуваць, як іграе кожны радок, кожнае слова. Я зразумеў: гэта твае карэнні, без іх немагчыма сапраўдная творчасць. І неаднойчы паўтараў гэта студэнтам. Ім цікава было ездзіць па рэспубліцы, запісваць фальклор, апрацоўваць яго. Завяршальны этап — 5 тысяч народных песень, якія ўвайшлі ў чатыры тамы.

РАДКІ З БІЯГРАФІІ: Нарадзіўся ў вялікай сялянскай сям'і, рабіў тое, што і ўсе вясковыя дзеці. Адно памятае добра: ніколі не гультайнічаў, бо ведаў, як цяжка даецца бацькам кожны кавалак хлеба.

**— Як Вы думаеце, чым адрозніваецца Ваша перадвыбарная платформа ад праграм іншых кандыдатаў?**

— Аддрозненне гэта залежыць у асноўным ад прафесіі, узросту кандытата. Але яно не такое істотнае. Проста адны больш увагі ўдзяляюць экалогіі, другія — сацыяльнай сферы, трэція — культуры. А наогул усе праграмы ўкладваюцца ў рэчышча перабудовы.

**— Калі Вас выберуць дэпутатам, якія задачы будзеце вырашаць у першую чаргу?**

— Вазьміце любую сферу нашага жыцця: усюды без цяжкасцей можна знайсці праблемы, недахопы. І ўсе яны патрабуюць неадкладнага вырашэння.

Сёння ў Мінску 1700 відаў тавараў занесены ў спіс дэфіцытных. А якасць? З такой не хутка дасягнем мы пашаны не імпартным (на іх, дарэчы, і зарплаты мала), а нашым, айчынным, рэчам. Безумоўна, за год-два гэтага не зробіш, бо нам патрэбна цалкам рэканструяваць эканоміку, але пачынаць трэба сёння.

Аднойчы здарылася ў мяне сустрэча, якая моцна ўскалыхнула сэрца, прымусіла задумацца і над такой важнай сацыяльнай праблемай, як матэрыяльнае забеспячэнне пенсіянераў. Неяк зайшоў да мяне пісьменнік (зараз стары, на пенсіі, кніжкі пісаць здароўе не дазваляе). Разгаварыліся пра жыццё-быццё. Я яго магчымасці адпачыць пазайздросціў. А ён: «Чаму тут радавацца? Пенсія — 72 рублі. Ледзь на жыццё хапае. Бачыш, на мне касцюм — ён і на будзень, і на свята, у ім і ў труну лягу».

Сэрца сціснулася ад гэтых слоў. Падумалася: колькі ў нас такіх пенсіянераў, месячны даход якіх складае 40—60 рублёў. Як зрабіць так, каб людзі не баяліся старасці? Гэта таксама наш, дэпутацкі, клопат.

Але ўсе астатнія праблемы не маюць сэнсу, калі не вырашыць адну з самых важных — экалагічную. Ад чысціні паветра, чысціні вады залежыць жыццё на Зямлі. І таму не адкладваючы ні на тыдзень, ні на дзень, ні на гадзіну мы павінны змагацца за чыстае, прыгоднае для жыцця навакольнае асяроддзе.

РАДКІ З БІЯГРАФІІ: Калі пачалася вайна, яму было дзесяць гадоў. Полымя ваеннага ліхалецця загартавала яго характар, прымусіла рана стаць дарослым. Тыя цяжкія і суровыя гады надалей знайшлі яскравае адлюстраванне ў яго творчасці — вершах, паэмах, мемуарах. Ды і сёння гэта тэма выліваецца ў радкі пісьменніка. Нядаўна выйшла яго кніга «Перажыўшы вайну».

**— Як чалавека, які працуе на ніве культуры, Вас, бясспрэчна, непакоіць клопат аб нацыянальнай мове, культуры — нацыянальнай спадчыне нашага народа.**

— Я чакаў гэтага пытання. Бо і вас хвалюе тое ж, што і мяне.

Мы часта гаворым пра культ асобы і перыяд застою. Нельга абысці гэтыя часы і сёння. Бо іменна ў гады культу асобы мы пачалі адыходзіць ад ленінскай палітыкі ў нацыянальным пытанні, а ў гады застою ў нас склаліся амаль варожыя адносіны да інтэлігенцыі, наогул да культуры. Паступова разрастаўся, пускаў карэнні нацыянальны нігілізм. Тут да месца ўспомніць трапны выраз, які мы часта ўжываем, на жаль, мала разумеючы сапраўдны яго сэнс: «Без гісторыі няма будучыні».

Сёння мы апамяталіся, спрабуем нешта выправіць, вярнуць сваю нацыянальную мову. Зразумелі, што без мовы няма нацыі. Але чутны галасы, быццам, падняўшы беларускую мову на ўзровень дзяржаўнай, мы закранём інтарэсы людзей іншых нацыянальнасцей. Думаю, гэтага не здарыцца, бо той, хто любіць сваю зямлю, сваю мову, будзе паважаць і іншыя мовы і народы.

У Саюзе пісьменнікаў нарадзілася цікавая ініцыятыва: стварыць таварыства беларускай мовы. Мэта яго — прапаганда роднага слова, нацыянальнай гісторыі, культуры. Нешта накшталт яго можна было б арганізаваць на прадпрыемствах, у школах, ВНУ. І ў гэтай справе мы, пісьменнікі, павінны трымаць руку на пульсе жыцця.

**— Ніл Сямёнавіч, ужо каторы год Вы дэпутат Вярхоўнага Савета рэспублікі. Ці прыносіць Вам задавальненне гэта дзейнасць? Як ажыццяўляецца на справе лозунг «Уся ўлада Саветам!»?**

— Бяда ў тым, што ўлады той было — кот наплакаў. Функцыі Саветаў усіх рангаў зводзіліся да аднаго: зацвярджаць гатовыя рашэнні. Якія там спрэчкі ці гарачыя дыскусіі?!

Памятаю, увялі мяне ў састаў камісіі па культуры і народнай адукацыі. Мы займаліся выпрацоўкай законапраекта аб народнай адукацыі. Пяць разоў збіралася камісія, і кожны раз я прасіў слова: гаварыў аб неабходнасці ўнесці дапаўненне, якое ўраўнавала б беларускую і рускую мовы ў школах рэспублікі. На жаль, мне гэта не ўдалося: маю прапанову падтрымаў толькі адзін член камісіі — рабочая-плітачніца. Астатнія прагаласавалі за той праект, які прапанавалі «зверху». Так што, якое задавальненне можа быць — адны турботы.

Зараз жа сітуацыя мяняецца. У Саветах нам ужо не патрэбны «маўчальнікі» і «галасавальнікі». Мы павінны выбраць людзей, якія б мелі мужнасць узняць пэўнае пытанне, маглі адстаяць свой пункт гледжання, абараніць інтарэсы народа. А для гэтага неабходна ведаць, чым жывуць людзі, што іх турбуе, і самому жыць іх клопатамі.

РАДКІ З БІЯГРАФІІ: 40 гадоў аддадзена літаратуры, навуцы, грамадскай дзейнасці. За гэты час выйшла каля 50 кніг — вершаў, нарысаў, паэм, артыкулаў, эсэ, п'ес, навуковых манаграфій. Асобнае месца ў дзейнасці Н. С. Гілевіча займаюць пераклады: з украінскай, польскай, рускай, сербалужыцкай моў — усяго больш за 20 тамоў. За прапаганду літаратуры братніх народаў пісьменнік узнагароджаны балгарскім ордэнам Кірылы і Мефодзія і ордэнам Югаслаўскай Зоркі з лентай.

Газетныя рамкі не дазваляюць нават пералічыць усе тыя пытанні, якія задалі кандыдату ў народныя дэпутаты СССР. Думаю, пакрыўджаных не засталося, бо на ўсе пытанні Ніл Сямёнавіч даў абгрунтаваныя адказы. Так, ён імкнецца трымаць руку на пульсе жыцця.

Запісала
З. АЛЯШКЕВІЧ.

# АБОДВА — ДАСТОЙНЫЯ

15 САКАВІКА на факультэце радыёфізікі і электронікі і біяфаку адбылася сустрэча з кандыдатамі ў народныя дэпутаты СССР — першым сакратаром Мінскага гаркома КПБ У. Р. Галко і генеральным дырэктарам вытворчага аб'яднання «Белпрамкультура» А. А. Новікавым. Мы папрасілі некаторых удзельнікаў гэтай сустрэчы падзяліцца сваімі ўражаннямі аб перадвыбарных праграмах кандыдатаў і аб атмасферы размовы, што адбылася.

Дэканы абодвух факультэтаў — і Аляксандр Міхайлавіч Шырокаў, і Адам Сямёнавіч Шуканаў — выказалі задавальненне сустрэчай. Адзначылі добрую эрудыцыю У. Р. Галко, яго сапраўднае веданне праблем горада і сучаснага жыцця наогул. А. А. Новікаў таксама выглядаў як дзелавы чалавек. Але А. М. Шырокаў не згадзіўся з пунктам праграмы гэтага кандыдата — вырашыць жыллёвую праблему шляхам скарачэння кватэрнай плошчы тых, у каго яна «лішняя».

**Аліна Васільеўна Пятрэнка**, дацэнт кафедры фізіялогіі раслін біялагічнага факультэта:

— Цікавая была сустрэча. Абодва кандыдаты здаюцца мне дастойнымі быць дэпутатамі. Спадабалася, што У. Р. Галко шмат увагі ўдзяліў праблеме сацыяльнай справядлівасці, стараўся адказаць на ўсе пытанні. Можна было заўважыць, што нялёгка далася яму гэта сустрэча. Можа, не хапіла псіхалагічнай падрыхтоўкі, а магчыма, адыгралі адмоўную ролю нетактоўныя паводзіны некаторых студэнтаў. Недалёка ад мяне сядзелі хлопцы і дзяўчаты з факультэта радыёфізікі і электронікі, якім нават давялося заўвагі рабіць — так непрыгожа выглядалі іх рэплікі, большасцю недарэчныя.

Многіх турбуе зараз, што будзе з нашай дубравай. Першы сакратар гаркома запэўніў, што будаўніцтва канчатковае спынена. Гэтыя словы мяне асабіста пераканалі, далі вялікую надзею.

Станоўчае ўражанне пакінуў у мяне і другі кандыдат — А. А. Новікаў. Ён добра ведае сваю справу, патрэбы і турботы рабочых людзей — гэта бачна адразу, калі слухаеш Анатоля Авер'янавіча. Прыемна было пачуць, што яго хвалюе і лёс жанчын, якім даводзіцца займацца на вытворчасці цяжкай работай, працаваць у трэцюю змену.

Я жыву ў Маскоўскім раёне, таму 26 сакавіка мне давядзецца галасаваць за кагосьці з гэтых кандыдатаў — за Галко або Новікава. Пакуль я яшчэ не вырашыла, каму аддам перавагу...

**Некалькі студэнтаў 4-га курса факультэта радыёфізікі і электронікі:**

— Сапраўды, сустрэчу суправаджалі рэплікі і смяшкі, калі кандыдаты пачалі адказваць на пытанні. Нам здаецца, гэта таму, што некаторыя студэнты ішлі сюды з недаверам: маўляў, што кандыдат ні скажа — гэта проста перадвыбарныя абяцанні, якія наўрад ці ажыццяўяцца. Агульныя словы ў абодвух праграмах былі. Але на многія пытанні мы атрымалі задавальняючыя адказы. Вельмі хочацца спадзявацца, што яны будуць выкананы, асабліва тыя, што датычаць нашай дубравы.

Падрыхтавала В. БЯГУН.

## Час пік



# Электронныя гульні

**НЕВЯЛІЧКАЕ памяшканне, у ім чалавек дванаццаць, але ўсе сталы, на якіх свецяцца зялёныя экраны ЭВМ, заняты. У самым разгары заняткі па курсу «Вылічальныя машыны і праграміраванне» у другакурснікаў мехмата. Тэма — знаходжанне інтэграла.**

**Некаторыя гатовы сядзець каля дысплеяў да вечара. Ім падабаецца праводзіць анкетаванне, складаць праграмы біярытмаў. Хочацца паспрабаваць і задачы, і вершы, і малюнкі. Што гэта — захапленне?**

**— Гэта — як размова з разумным чалавекам, з якім заўсёды цікава,—** гаворыць выкладчыца Н. Т. Дземідовіч.— Са з'яўленнем дысплейных класаў у студэнтаў стала больш цікавасці да прадмета, бо цяпер у іх ёсць практыка. Нам не хапае імпартных персанальных ЭВМ. Тыя айчынныя, на якіх працуюць студэнты, ненадзейныя, часта псуюцца, ды і адрамантаваць іх не так проста.

Але — паглядзіце на здымкі. Цікавасць ёсць, нават і да не вельмі надзейных дысплеяў. Значыць, павінен быць і добры вынік!

А. КУЗНЯЦОВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.
Фотакалаж С. ГРЫЦА.

Уражанні ад практыкі

# Хвалі скрыюць усё?









ЛЕТНЮЮ практыку мы, студэнты геафака, праходзілі ў Валожынскім раёне на геастанцыі «Заходняя Бярэзіна». Набывалі практычныя веды па гідралогіі, геамарфалогіі, ландшафтазнаўству. Зразумела, пасля заняткаў заставалася нямала вольнага часу. Мы вырашылі яго прысвяціць карыснай справе — ахове прыроды. Тым больш, што сярод нас было шмат членаў дружыны аховы прыроды, што ўжо год дзейнічае на факультэце.

Са свайго невялікага вопыту мы паспелі зрабіць сумны вывад—сёння яшчэ шмат людзей, чые адносіны да прыроды без перабольшання можна назваць жорсткімі і карыслівымі. Не быў у гэтым сэнсе выключэннем і Валожынскі раён. Тут мы затрымлівалі аўтааматараў, што прама на беразе Бярэзіны мылі машыны, забруджваючы ваду. Дарослым людзям даводзілася тлумачыць элементарныя рэчы...

Неаднойчы сустракаліся і з браканьерамі. Усе знойдзеныя сеці мы канфіскоўвалі і прыносілі на базу. Нярэдка, як гэта ні парадаксальна, гэтыя «здабыткі» без усялякага сораму нас прасілі аддаць ім работнікі базы, а часам нават і нашы выкладчыкі. Некаторыя з іх абураліся: «Якое вы маеце права забіраць у вяскоўцаў сеці?» Дацэнт В. Р. Сінякова нават загадала, каб мы нікога не затрымлівалі, а проста гаварылі парушальнікам, каб яны больш гэтак не рабілі.

Але ж гэта наіўна! Мы на практыцы зведалі браканьерскі нораў і пераканаліся, што не тое што словы, штрафы і агалоскі не дапамагаюць іх «перавыхаванню».

Непадалёк ад нашай станцыі знаходзілася ферма калгаса «Перамога». Дык вось аднойчы каля невялічкага хлеўчыка ў скрынях мы знайшлі здохлых кабанчыкаў. Па словах мясцовых жыхароў, іх звычайна скідваюць у раку. Сапраўды, чаго доўга думаць? Рака ж,— вунь яна, у трыццаці метрах ад хлеўчыка. Кідай,— хвалі схаваюць усё.

Ад невялікага жывёлагадоўчага комлексу таго ж калгаса жыжка сцякае ў забалочаную нізіну для адстойвання. Але, гэта бачна і неспецыялісту, прама з нізіны ідзе канава, па якой, асабліва ў дажджлівыя дні, атручаныя сцёкі трапляюць у раку. Калі мы паведамілі аб гэтым нашаму выкладчыку, прафесару Віктару Нікіфаравічу Кісялёву, ён сказаў: «Няхай ферма скідвае ў раку што хоча. А нам галоўнае — не сварыцца са старшынёй, бо наша база знаходзіцца на яго тэрыторыі». І гэтыя словы мы пачулі ад чалавека, які ўсур'ёз займаецца ў сваёй навуковай дзейнасці пытаннямі аховы прыроды!

Сумныя ўражанні засталіся ад гэтай практыкі. Дзеянні нашай дружыны ў большасці мясцовых жыхароў і некаторых выкладчыкаў не знаходзілі падтрымкі, наадварот, выклікалі недавер, незадаволенасць. Быццам мы рабілі нешта супрацьпраўнае.

На словах мы ўсе разумеем, што настаў час сур'ёзна ахоўваць прыроду. Але на справе мала хто з нас здольны дзеяннем абараніць яе. Але ж без канкрэтных спраў у абарону кожнага кутка прырода так і застанецца бездапаможнай і сіратлівай. І ніхто потым не зможа вярнуць ёй былое багацце і прыгажосць.

Ю. ЖАРКО,
камандзір дружыны аховы прыроды геаграфічнага факультэта.

НА ЗДЫМКАХ: сіваграк; лясны велікан; вушастая сава; казуля.

Фота М. ЧЭРКАСА.



Думкі ўслых

## НЕ ШУКАЙЦЕ КРАЙНЯГА

Што можа быць больш жахлівым, чым гібель людзей у мірны час?

...20 красавіка 1988 года ў пакоі адміністрацыйнага будынку па завулку Аўтадараўскаму быў знойдзены труп работніцы гэтай установы Р. І. Мажэйка з адзнакамі гвалтоўнай смерці. Праведзенымі аператыўна-следчымі мерапрыемствамі ўстаноўлена, што забойства здзейсніў яе муж А. С. Мажэйка, які потым скончыў жыццё самагубствам.

Доўга шукаць сапраўднага віноўніка не давялося. Матэрыяламі следства ўстаноўлена, што Мажэйка сістэматычна п'янстваваў, учыняў сваркі з жонкай.

Толькі за мінулы год у Маскоўскім раёне работнікі міліцыі зрабілі больш за тысячу выездаў для разбору сямейна-бытавых канфліктаў. Складзена 250 актаў, 180 пратаколаў за дробнае хуліганства, па якіх вінаватыя прыцягнуты да адказнасці. Каля 200 сямейных канфліктаў вырашаны вусным разборам.

Удумайцеся ў гэтыя лічбы: за імі праца дзесяткаў супрацоўнікаў міліцыі, якія павінны займацца папярэджваннем і раскрыццём злачынстваў. Дзе гарантыя таго, што ў час выезду на сямейны скандал дзяжурнай аўтамашыны не адбудзецца цяжкае злачынства ў іншым месцы?

Пакуль з правапарушэннямі ў быце змагаецца адна міліцыя. На жаль, на прадпрыемствах, ва ўстановах недастаткова эфектыўна рэагуюць на паведамленні міліцыі. Ды і суседзі па лесвічнай пляцоўцы хіба не ведаюць, калі ў суседняй кватэры сварка?

Чаму работнікаў міліцыі робяць вінаватымі амаль у кожнай негатыўнай сацыяльнай з'яве? Муж пасварыўся з жонкай — куды ж міліцыя глядзіць? У грамадскім транспарце хуліганяць падлеткі — дзе ж міліцыя? Чаму пачала знікаць старая неблагая традыцыя — агульнымі намаганнямі змагацца з хуліганамі, сілай грамадскага ўздзеяння вырашаць на месцы ўзнікшыя канфлікты? Малую бяду, не чакаючы, пакуль яна ператворыцца ў сілу, што знішчае жыццё, можна развесці і рукамі грамадскасці.

В. АЎСЯННІКАЎ,
намеснік начальніка Маскоўскага РАУС г. Мінска;
С. КУНІЦКІ,
старшы інструктар палітаддзела УУС Мінгарвыканкома.

На ростанях

# Спрэчны экзамен

СТАРАДАЎНІ студэнцкі анекдот сцвярджае, што для студэнтаў нечаканых экзаменаў не існуе. Варта толькі папярэдзіць хаця б за ноч да пачатку іспыту, і патэнцыяльны студэнт вывучыць нават кітайскую мову. І ўсё ж экзамен па марксізму-ленінізму зваліўся на сёлетніх пяцікурснікаў, як снег на галаву. Хто б мог падумаць, што давядзецца зноў вяртацца да пройдзеных раней курсаў гісторыі КПСС і палітэканоміі, філасофіі і навуковага камунізму? Зрэшты, і часу на роздум было крыху больш, чым у тым жа анекдоце.

Студэнты геафака выходзілі з аўдыторыі задаволеныя: экзамен здадзены. Праўда, асаблівай радасці перамогі не адчувалася. Ала Хурс: «Шчыра кажучы, ахвоты здаваць экзамен ў мяне не было. Вось і паўтарыла толькі тое, што калісьці вывучыла на малодшых курсах, абмежавалася канстатацыяй падручніка. Перавярнуць матэрыялы друку па чатырох прадметах за адведзены тэрмін немагчыма. Ды і не ўсе публікацыі ў перыёдыцы — ісціна ў апошняй інстанцыі. Пры сённяшнім плюралізме думак выпрацаваць адзіна правільны пункт гледжання немагчыма. Нават самім грамадазнаўцам, палітэканомам і філосафам цяжка, не тое, што нам. Вось калі б вучэбны дапаможнік быў адмысловы, прынамсі, ведалі б, чаго ад нас патрабуюць. І наогул, навошта гэты экзамен? Па сутнасці ён фармальны».

З меркаваннем Алы згодны амаль усе яе аднакурснікі. А вось выкладчыкі выказвалі свой пункт гледжання не так адназначна.

Пётр Сяргеевіч Лямешчанка, старшыня экзаменацыйнай камісіі, дацэнт кафедры палітэканоміі: «Экзамен па грамадскіх навуках патрэбны. Кожны студэнт павінен мець не павярхоўнае ўяўленне аб грамадска-палітычных працэсах, а свой погляд, сваю пазіцыю. Што ж датычыць падручніка, то я супраць падрыхтоўкі толькі па ім. Падручнік разлічаны на студэнта ніжэй сярэдніх здольнасцей».

Уладзімір Ільіч Максін, дацэнт кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў: «Падтрымліваю пункт гледжання студэнтаў. Нельга, не патрэбна цяпер уводзіць экзамен па марксізму-ленінізму. Спачатку неабходна нам, грамадазнаўцам, палітэканомам і філосафам, канчаткова разабрацца ва ўсіх пазітыўных і негатыўных з'явах, што мелі месца ў нашым грамадстве, каб не рабіць новую пераацэнку каштоўнасцей праз некалькі год».

Розныя думкі, розныя меркаванні, а экзамен ідзе. Як канчаткова вырашыцца пытанне з яго правядзеннем? Пачакаем звестак з Дзяржаўнага камітэта па народнай адукацыі.

Д. МАЛІНОЎСКІ.

## Родная мова

ШТО ЗРОБІШ, калі страцілі беларусы родную мову? Аднаго задавальняе хоць на паперы быць беларускамоўным. Другі шукае апраўданне ў тым, што «па-чалавечы» яна ніколі не жыла: і пры панах — «мужыцкая», і цяпер — «вясковая». Трэці... Адмаўляецца ад перакanання, што мова народу не патрэбна. Ён імкнецца да кожнай магчымасці бачыць яе не стужкай, скамечанай гарадской гаворкай былога вяскоўца, не сарамлівай крынічкай трапных выразаў у брудным моры памылак, а гучнай, багатай, прыгожай.

«Навошта географу мова?» — не разумее аўтар аднаго з лістоў у рэдакцыю «Беларускага універсітэта». Што ж, мне пашчасціла знайсці зацікаўленых людзей і на тым жа геафаку.

Пачынаючы з мінулага года, на першым курсе тут (як, дарэчы, і на іншых факультэтах) вывучаюць родную мову. На другім цяперашнія першакруснікі будуць авалодваць беларускай літаратурай, на трэцім — слухаць лекцыі па геаграфіі БССР на беларускай мове.

# Пачатковы мерыдыян

— Амаль усе мы паедзем працаваць у вясковыя школы, а гэта значыць, будзем выкладаць геаграфію на беларускай мове. Вымаўленне, выказванні, тэрміналогія... А дзе вучыцца? — адказала Іна Альшэўская пытаннем на пытанне «Ці патрэбна вывучаць беларускую мову?»

— Лічу, што веданне роднай мовы спатрэбіцца нам у жыцці. На крайні выпадак, не пашкодзіць,— як дапаўненне прагучалі словы Алены Носавай.

Два меркаванні. Голас групы. Магчыма, усяго курса.

...У той дзень заняткі па беларускай мове стаялі першай парай. І хоць пачыналіся яны рана, аўдыторыя хутка напаўнялася.

— І ў вас няма тых, хто прагульвае? — маё здзіўленне знікла, як толькі прагучаў званок і пачаліся заняткі. Было падарожжа па краіне (студэнты ж — географы), у час якога ўсе размаўлялі па-беларуску. І мяне ўзяла зайздрасць. Я зразумела тых, хто не лянуецца ўставаць рана, каб паспець на заняткі, хто не прыносіць іх у ахвяру сваім асабістым справам.

— Так, у нас цікава,— гаворыць Валянціна Піліпаўна Трайкоўская, кандыдат філалагічных навук, выкладчыца беларускай мовы на геафаку.— Імкнёмся разнастаіць заняткі. Будучыя географы павінны ведаць перш-наперш краіну, а не вывучаць аднастайнае, надакучлівае аканне, яканне. З гэтай мэтай мы і абмяркоўваем тэмы горада, вобласці, рэспублікі, іх клімату, прыроды, выкапняў, геаграфічнага становішча. Гэта пашырае кругагляд, робіць географаў мовазнаўцамі, сапраўды адукаванымі людзьмі.

А як уразілі дзяўчат і хлопцаў запісы дыялектаў нашай Беларусі. Часам столькі незвычайнага і смешнага было ў гаворках — для адных, роднага, зразумелага — для другіх. А размовы аб разнастайнасці тлумачэнняў з'яў прыроды? Нават звычайныя дождж і сонца вызначаліся вельмі ж неаднолькавымі характарыстыкамі: «сірочыя слёзы», «грыбны дождж», «божы» і «цыганскі».

— Навучэнцы нашы,— працягвае Валянціна Піліпаўна,— з розным веданнем беларускай мовы, з розным вымаўленнем. Але лічу, што дзяліць іх на групы вывучэння немэтазгодна. У гурце слабейшы вучыцца ў мацнейшага ў працэсе зносін, жывой размовы. Галоўнае — імкненне, ахвота. А гэтага ім не займаць.

— Таму што першы курс? Яшчэ не абцерліся, не прызвычаіліся...

— Магчыма, і так. Нават, дакладна так. На курсе трэцім яны б ўжо не цягнуліся да заняткаў, а цяпер... Усё новае — цікава.

І ўсё ж да пятага курса многае забудзецца, калі няма практыкі. Падмогай у гэтай справе мог бы стаць факультатыў для паўтарэння, замацавання ведаў перад жыццёвым стартам. Хто хоча, каму патрэбна,— наведвай, самападрыхтоўвайся.

— Слушная прапанова. Гэта было б вельмі дарэчы. А то неяк не па сабе робіцца, калі прысутнічаеш на «адкрытым» уроку ў вясковай школе і чуеш дылетанцкія спробы выказацца на беларускай мове.

Але калі б самі выкладчыкі чыталі курсы лекцый на беларускай мове, факультатыў быў бы непатрэбны. Дарэчы, І. П. Галай, дацэнт, кандыдат геаграфічных навук, аўтар «Геаграфічнага слоўніка для школьнікаў», запэўнівае, што, калі толькі дазволяць, ён пераклаў бы з рускай мовы на беларускую ўсе неабходныя падручнікі. Ды гэта — перспектыва.

...А заняткі працягваюцца. Гучыць голас выкладчыка. Спачатку нясмелы, а потым, набіраючы моц,— студэнта. Пачалася размова на геаграфічную тэму. Так што паняцці «геафак» і «беларуская мова», аказваецца, звязаны паміж сабой, неабходны адзін аднаму. Як хочацца верыць, што гэта не толькі даніна часу.

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ,
студэнтка факультэта
журналістыкі.

## А што ў вас?

# Слова, як песня, на вуснах



БЫВАЕ так, што ява аказваецца ярчэйшай за спадзяванні. Шкада, не часта такое здараецца. А мне пашчасціла прысутнічаць на тэатралізаваным прадстаўленні «Летуценніка», якое адбывалася ў мінулую пятніцу ў Палацы культуры Белсаўпрофа. Раней чула, што існуе на філалагічным факультэце тэатральная студыя. Збіралася ўважліва прагледзець праграму, адабраць лепшае, дадаць некалькі эпітэтаў і ўзнёслых фраз і прапанаваць чытачам.

Вы ўжо даруйце, шаноўныя летуценнікі, за колішнія мае меркаванні. Зараз я думаю інакш. І баюся, што словы акажуцца толькі крохкай абалонкай той сапраўднай асалоды, якую зведала, пабачыўшы ўрыўкі з купалаўскіх «Прымакоў» і «Паўлінкі». Мова ваша — заслухацца. Такая па праву заслугоўвае эпітэта «мілагучная». Жывая мова.

А на маленькай сцэне — простыя дэкарацыі, саматканыя дываны ды абрусы, гліняны посуд. Мусіць, і ўсё. Касцюмы? Не сказаць, каб дужа мудрагелістыя, але з густам падабраныя. Пабачыла я вас на сцэне. З якім імпэтам іграеце! Як проста і хараша ўсё атрымліваецца, з якой душой спяваеце і танцуеце! Якія паважлівыя адносіны да кожнага вымаўленага слова!

З «Прымакамі» і «Паўлінкай», а таксама з іншымі тэатралізаванымі прадстаўленнямі дзе толькі ні выступалі «Летуценнікі»: у школах і калгасах, Доме настаўніка, Доме літаратара. Ёсць асабліва памятныя сустрэчы з гледачамі. Летась адзначалася 80-годдзе выхаду ў свет «Жалейкі», выступалі студэнты ў Купалаўскім музеі. А аднойчы малодшая група «Летуценніка» пабывала на Любаншчыне, у калгасе імя БВА, мясцінах, дзе калісьці пісаў Купала паэму «Над ракой Арэсай». Паказвалі паэтычную кампазіцыю. Дык бабулі ў зале плакалі, а пасля прыходзілі і казалі: «Яно ж так і было, дзяўчаткі, мы ўсё гэта памятаем».

Шмат людзей прайшло праз «Летуценнік». Раз'ехаліся яны па Беларусі пасля заканчэння філфака, арганізавалі ў сваіх школах гурткі выразнага чытання і тэатральныя студыі. І так увесь час — адны ад'язджаюць, другія прыходзяць. Толькі кіраўнік студыі не пакідае яе, жыве з «Летуценнікам» поруч, уносіць у яго лірычны струмень. Гэта Маргарыта Барысаўна Яфімава, дацэнт кафедры беларускай літаратуры. Удзельнікі «Летуценніка» з цёплынёй і павагай адносяцца да яе, называюць «нашай натхняльніцай». У гэтых словах перабольшання няма. І калі М. Б. Яфімава — рэжысёр, то памочнікам сваім называе яна студэнта Валодзю Куліковіча. Няма, напрыклад, касцюмаў, Валодзя абавязкова знойдзе іх. Адкуль і як — невядома. А які музыка! Усе ў студыі лічаць: нарадзіўся з гармонікам.

«Летуценнік» існуе даўно. Пачынаўся з гуртка выразнага чытання. Вырас у тэатральную студыю. І сваю галоўную задачу бачаць студэнты ў тым, каб не проста самім карыстацца духоўнымі скарбамі беларускага народа, а ўмець аддаваць іх людзям. І найдаражэйшы скарб — мова. Летуценнікі ўмеюць беларускае слова вымавіць так, каб ім заслухаліся, каб яго пасля паўтарылі. Дзякуй ім за гэта!

Паназірайце за «Летуценнікам» — вы адчуеце тонкую беларускую інтэлігентнасць яго ўдзельнікаў. Мусіць, гэта абумовіла атмасферу студыі: па-сапраўднаму творчую, дзе робяцца адкрыцці, дзе існуе пошук.

Ад душы хацелася б, каб не згубіў ніколі «Летуценнік» назбіраныя скарбы, каб дбайна захоўваў іх, перадаючы з рук у рукі.

Л. НАВІЦКАЯ,
студэнтка факультэта
журналістыкі.

НА ЗДЫМКАХ: у час выступлення «Летуценніка».

Фота С. ГРЫЦА.








БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПЛ імя Я. Коласа.
23 сакавіка
Зак. 1616.
Т. 2000 экз.



220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.



Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.